Источник: **«Звязда» - 2012-05-19**

## А горад не рады такім "жыхарам"...

Гадзюкі сёлета надта распладзіліся і сталі часта сустракацца ў Мінску і ў ваколіцах. Такая пагалоска пайшла пасля першых выпадкаў укусаў. Людзі сцвярджаюць, што бачылі ядавітых паўзуноў у парку на вуліцы Філімонава, у Драздах і побач з Мінскім морам.

Каб даведацца, наколькі праўдзівая сітуацыя, "Звязда" звярнулася ў Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук па біярэсурсах. Ці сапраўды варта так баяцца гадзюк? Як патлумачылі спецыялісты, пра рэзкае павелічэнне папуляцыі гэтых змей вакол Мінска гаварыць нельга. А актыўна выпаўзаюць са сваіх укрыццяў гадзюкі таму, што акурат на гэты час прыпадае перыяд іх размнажэння. Пацярпець давядзецца недзе месяц-паўтара. Прыкладна за такі час гадзюкі крыху супакояцца і схаваюцца ад людскіх вачэй. Але, трэба сказаць, нязручнасцяў у блізкім з горадам існаваннем змеі не бачаць. Яны адаптуюцца да новых умоў. У тым, што гадзюк сёння можна пабачыць у гарадскіх паркавых зонах, няма нічога дзіўнага. Жыць там ім нашмат зручней, чым у раскапаных кар'ерах і на будоўлях, якіх шмат вакол Мінска.

*Ганна ГАРУСТОВІЧ*